УДК 821.161.3-3:159.96

# ЗМЕНЕНЫЯ СТАНЫ СВЯДОМАСЦІ Ў АПОВЕСЦІ Ю. СТАНКЕВІЧА “БЕСАПАТАМ”

***В. А. Каменюкова*** (ГДУ імя Ф. Скарыны)
Навук. кір. ***А. В. Брадзіхіна***,
канд. філал. навук, дацэнт

Чалавек уяўляе сабой сімбіёз матэрыяльнага і духоўнага пачаткаў, гармонія паміж якімі нярэдка парушаецца ў складаныя моманты жыцця. У выніку ўзнікае стан двайніцтва, выяўлены праз унутраны голас, раз’яднанне цела і душы, падваенне свядомасці, матэрыялізацыю часткі свядомасці. Аддзяленне часткі свядомасці герояў ад цела ў літаратурных творах можа быць спантанным і свядомым. Сантэхнік Ілля, адзін з трох цэнтральных персанажаў аповесці Ю. Станкевіча “Бесапатам”, свядома стварае ўмовы (наркатычнае ап’яненне), у якіх становіцца магчымым такое раздваенне. Гэты зменены стан свядомасці параўноўваецца з медытацыяй, якую герой практыкуе з дзяцінства. Мужчына апантана вандруе ў іншым вымярэнні, дзе “імкнецца эмпірычным шляхам дасягаць найвышэйшага стану свядомасці, так званага Высокага Ўзроўню” [1]. З прагай набыцця ведаў, якія робяць чалавека вечным, звязана філасофская праблема неўміручасці чалавека як дару ці праклёну. Так, для Іллі гэта найвялікшы дар; для Евы, з якой сантэхнік падзяліўся сваёй таямніцай і якая сама сутыкаецца з праявамі ірэальнага, неўміручасць – гэта ўсяго толькі збой: “Калі б вы нават і падсунулі мне ў нос вашу неўміручасць, вы што, сур’ёзна лічыце, што яна нечага вартая? <…> І няма ніякага Высокага Ўзроўню. Звычайны «глюк» – і ўсё” [1]. Цаной неабмежаваных ведаў стновяцца вечныя пакуты. Ілля, дасягнуўшы сваёй мэты – Высокага Ўзроўню, трапляе ў дэманічную пастку, з якой яго душа ніколі не зможа выбрацца. Фізічная абалонка мужчыны праз некаторы час знікае самым непрыемным чынам: гніе ў ваннай, запоўненай вадой. Ева таксама памірае – здзяйсняе



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

самагубства. На мяжы жыцця і смерці жанчына адчувае прысутнасць Бесапатама, закладнікам якога стаў сантэхнік. Але гсраіня сустракае яго як роўнага.

Такім чынам, раздзяленне душы і цела літаратурных персанажаў можа быць стыхійным і свядомым. Такая мадэль двайніцтва ў аповесці Ю. Станкевіча "Бесапатам" дае магчымасць асвятліць праблемы пошукаў чалавекам сэнсу жыцця, неўміручасці, паказаць яе абясцэньванне, скажэнне пад уздзеяннем розных сацыяльных фактараў, у прыватнасці наркаманіі.

### Літаратура

1. Станкевіч, Ю. Бесапатам [Электронны рэсурс] / Ю. Станкевіч. – Рэжым доступу: http://knihi.com/Jury_Stankievic/Biesapatam.html. – Дата доступу: 28.05.2019.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова